# *Маўленчыя сігналы-клішэ як спосаб навучання сачыненню-разважанню*

**Ступчык Наталля Фёдараўна,**
**настаўнік беларускай мовы і літаратуры кваліфікацыйнай катэгорыі «настаўнік-метадыст» УА «Дзяржаўная гімназія №1 г.п.Зэльва»**

**Сачыненне** — від творчай працы па развіцці звязнага маўлення вучняў, які прадугледжвае стварэнне вуснага ці пісьмовага выказвання.



ProPowerPoint.Ru

Разважанне – гэта форма сачынення, у якой аўтар выказвае свае меркаванні на пэўную тэму і пацвярджае іх аргументамі.



У аснове разважання ляжыць логіка мыслення і ўменне аналізаваць інфармацыю.

ProPowerPoint.Ru

## Памятка «Рыхтуемся да сачынення-разважання»

**Разважанне** — форма сачынення, у якой аўтар выказвае свае меркаванні на пэўную тэму і пацвярджае іх аргументамі.

**ТЭЗІС** (сцверджанне, якое неабходна даказаць) → **АРГУМЕНТЫ** (лагічныя пасылкі, якія выкарыстоўваюцца з мэтай доказу тэзіса) → **ВЫВАД** (падагульненне)

### Простыя шаблоны разважання

**1.** Прывядзенне аргументаў «за» і «супраць».

Аўтар паказвае розныя погляды на тэму і аналізуе іх, выяўляючы перавагі і недахопы кожнага. Потым выказвае ўласнае меркаванне і абгрунтоўвае яго, абапіраючыся на аргументы.

**2.** Аналіз прычын і вынікаў.

Аналізуюцца розныя фактары, якія могуць паўплываць на пэўную сітуацыю або з'яву. Потым тлумачыцца, як гэтыя фактары ўзаемазвязаны і якія наступствы яны могуць мець.

**3.** Прывядзенне прыкладаў.

Прыводзяцца і аналізуюцца канкрэтныя сітуацыі, якія ілюструюць пункт гледжання аўтара, сведчаць пра пэўныя з'явы або заканамернасці, робяцца высновы.

### Складаныя шаблоны разважання

**1.** Шаблон «Параўнанне — кантраст».

Параўноўваюцца два ці больш аб'екты, з'явы ці падзеі, паказваюцца іх падабенствы і адрозненні. Потым аргументуецца ўласны пункт гледжання, які грунтуецца на параўнаннях і кантрастах, робіцца выснова, у якой паказваюцца перавагі або недахопы аднаго з аб'ектаў.

**2.** Шаблон «Праблема — рашэнне».

Пачынаецца з апісання праблемы або пытання, потым прапануецца магчымае рашэнне або шляхі вырашэння праблемы. Заканчваецца высновай, у якой паказваецца важнасць і актуальнасць рэалізацыі прапанаванага рашэння.

| Частка | Спосабы падачы інфармацыі | Маўленчыя сігналы-клішэ, узоры-прыклады |
|---|---|---|
| Тэзіс (як пачаць?) | Даць тлумачэнне асноўнага слова ў тэзісе | Спагада — гэта спачуванне, выкліканае няшчасцем іншага чалавека, жывой істоты. Спачуванне абавязкова мусіць быць дзейсным, павінна выяўляцца ў добрых учынках, у дапамозе |
| | Пытанне і кароткі адказ на яго | Што такое чалавечнасць? Чалавечнасць — маральная якасць чалавека. Людзі, якія валодаюць такой якасцю, паважаюць іншых, спачуваюць ім, прыходзяць на дапамогу ў цяжкую хвіліну |
| | Невялікае разважанне аб актуальнасці | Сучасны свет, на жаль, далёкі ад дасканаласці, сустракаюцца чэрствасць і абыякавасць, таму людзі павінны быць больш уважлівымі і чулымі адзін да аднаго. Па гэтай прычыне, думаецца, слова «чалавечнасць» такое надзённае |
| | Пачаць з афарызма ці прыказкі | 1.1 Што такое спачуванне? На гэта пытанне вельмі дакладна адказаў беларускі пісьменнік ... : «...».<br>1.2 Што такое дабрыня? Каб адказаць на гэта пытанне, звярнуся да слоў ..., які сказаў: «...».<br>1.3 Усім вядома прыказка ... . |
| | і яго (яе) каментавання | 2.1 Каб пацвердзіць сказанае, звернемся да жыццёвых назіранняў.<br>2.2 Праілюстраваць сказанае можна прыкладамі з жыццёвага вопыту і мастацкіх твораў |
| Аргументы (доказы) | | 1. Абагульненне пэўных жыццёвых фактаў: жыццёвая гісторыя, якая адбылася з табой, з тваім сябрам, бацькамі або іх знаёмымі і пад.<br>2. Паказальная гісторыя са СМІ.<br>3. Зварот да прачытанага мастацкага твора, прысвечанага дадзенай тэме.<br>4. Зварот да кінастужкі (тэлеперадачы, падкаста, блога і інш.), у якім раскрыта дадзеная тэма.<br>5. Апора на гістарычныя (дакументальныя) факты ці статыстыку. Пераказ або цытаванне (пры неабходнасці) |



ProPowerPoint.Ru



| Частка | Спосабы падачы інфармацыі | Маўленчыя сігналы-клішэ, узоры-прыклады |
|---|---|---|
| Пераход да аргументаў | | 1. Паспрабуем разабрацца ў сэнсе гэтага паняцця (праблемы).<br>2. Каб даказаць свой пункт гледжання, звярнуся да мастацкіх твораў і жыццёвага вопыту.<br>3. Каб пацвердзіць думку, звернемся да мастацкіх твораў і прыкладаў з жыцця |
| Уключэнне аргументаў (доказаў) | | 1. У якасці правільнасці (слушнасці) выказанага тэзіса возьмем выпадак ... .<br>2. У якасці аргумента, які пацвярджае маю думку аб тым, што такое ..., хацелася б прывесці прыклад з жыцця.<br>3. Вельмі добра пра гэта гаворыцца ў ... . Аўтар даводзіць нам, што...<br>4. Разважаючы над пытаннем, што такое ..., хачу згадаць выпадак са свайго жыцця.<br>5. Вышэй адзначалася, што...<br>6. Дзеля пацвярджэння таго, як я разумею слова «...», прывяду прыклад з жыцця.<br>7. Пачаць аргументацыю мне хацелася б прыкладам з прачытанага мастацкага твора.<br>8. Акрамя таго, спашлюся на ўласны вопыт |
| | | Моўныя сродкі:<br>- дзеясловы 1-й асобы мн. ліку (дакажам, знойдзем, пацвердзім, прывядзём, вызначым і інш.);<br>- злучнікі і злучальныя словы (бо, так што, таму, калі, каб; для таго, каб і інш.) |
| | | Сінтаксічныя канструкцыі:<br>- гэта пацвярджаецца...; - гэта тлумачыцца тым...;<br>- гэта абумоўлена тым...; - прычына хаваецца ў наступным...;<br>- адсюль зразумела, што...; - з гэтага вынікае, што...;<br>- гэта дазваляе выказаць здагадку, што...<br>- як бачым, думаю, безумоўна, бясспрэчна, зразумела, напэўна, сапраўды, праўда, пэўна, відавочна, відаць, здаецца, здавалася, мабыць, магчыма, можа, мусіць і інш.;<br>- па-мойму, на мой погляд, з пункту гледжання (каго-небудзь), на думку (каго-небудзь), як вядома, як кажуць і інш. |
| Вывад | | 1. Думаю, мы пераканаліся, што...<br>2. У выніку мы пераканаліся, што...<br>3. Прыведзеныя доказы пераканалі нас у тым, што...<br>4. Усё сказанае пераконвае нас у тым, што...<br>5. Падводзячы вынікі, можна зрабіць выснову: ... .<br>6. Такім чынам, мы пераканаліся: ... .<br>7. Адным словам, словам, карацей кажучы, як гаворыцца, як бачна і інш. |

### Спіс выкарыстанай літаратуры


Валочка, *Г. М.* Як узнікаюць нашы выказванні? (Механізм стварэння тэксту як прадукту маўленчай дзейнасці) / Г. М. Валочка // Адукацыя і выхаванне. — 2004. — № 11. — С. 41—45.

Валочка, *Г. М.* Сачыненне ў сістэме развіцця звязнага маўлення навучэнцаў / Г. М. Валочка // Беларус. мова і літ. — 2023. — № 3. — С. 3—8.

Николаенко, *Г. И.* Теоретико-методические основы обучения жанрам речи на уроках русского языка в средней школе / Г. И. Николаенко. — Минск : НИО, 2001. — 271 с.

Никольская, *И. Л.* Учимся рассуждать и доказывать / И. Л. Никольская, Е. Е. Семёнов. — М. : Просвещение, 1989. — 192 с.

Саўко, *У. П.* Методыка навучання сачыненню / У. П. Саўко // Рэпазіторый БГПУ [Электронны рэсурс]. — Рэжым доступу: https://elib.bspu.by/bitstream/doc/10062/1/Методыка%20навучання%20сачыненню.pdf. — Дата доступу: 14.10.2023.

Маўленчыя клішэ – гатовыя ўзоры, дзякуючы якім лёгка структураваць сачыненне, не губляючы асноўную нітку разважанняў

ProPowerPoint.Ru

# Простыя шаблоны развагання

**1. Прывядзенне аргументаў «за» і «супраць»**

У такім выпадку, аўтар паказвае розныя кропкі погляду на тэму і аналізуе іх, выяўляючы перавагі і недахопы кожнай. Затым аўтар выказвае сваё ўласнае меркаванне і абгрунтоўвае яго, абапіраючыся на прадстаўленыя аргументы.

**2. Аналіз прычын і вынікаў**

Аўтар аналізуе розныя фактары, якія могуць паўплываць на пэўную сітуацыю або з’яву. Затым тлумачыць, як гэтыя фактары ўзаемазвязаны і якія наступствы яны могуць мець.

**3. Прывядзенне прыкладаў**

Аўтар прадстаўляе канкрэтныя сітуацыі, якія ілюструюць яго кропку погляду, аналізуе гэтыя прыклады і выводзіць агульныя заканамернасці або высновы.

ProPowerPoint.Ru

# Складаныя шаблоны разважання

**1. Шаблон «Параўнанне-кантраст»**

Аўтар параўноўвае два ці больш аб'екта, з'явы ці падзеі, паказваючы на іх падабенства і адрозненні. Затым аргументуе сваю кроку погляду, грунтуючыся на гэтых параўнаннях і кантрастах, і робіць выснову, паказваючы на перавагі або недахопы аднаго з аб'ектаў.

**2. Шаблон «Праблема-рашэнне»**

Аўтар пачынае з апісання праблемы або пытання, затым прапануе магчымае рашэнне або шляхі вырашэння гэтай праблемы і заканчвае высновай, паказваючы на важнасць прыняцця мер і рэалізацыі прапанаванага  рашэння.

ProPowerPoint.Ru

| Частка | Спосабы падачы інфармацыі | Маўленчыя сігналы-клішэ, узоры-прыклады |
| --- | --- | --- |
| Тэзіс (як пачаць?) | Даць тлумачэнне асноўнага слова ў тэзісе | Спагада — гэта спачуванне, выкліканае няшчасцем іншага чалавека, жывой істоты. Спачуванне абавязкова мусіць быць дзейсным, павінна выяўляцца ў добрых учынках, у дапамозе |
| | Пытанне і кароткі адказ на яго | Што такое чалавечнасць? Чалавечнасць — маральная якасць чалавека. Людзі, якія валодаюць такой якасцю, паважаюць іншых, спачуваюць ім, прыходзяць на дапамогу ў цяжкую хвіліну |
| | Невялікае разважанне аб актуальнасці | Сучасны свет, на жаль, далёкі ад дасканаласці, сустракаюцца чэрствасць і абыякавасць, таму людзі павінны быць больш уважлівымі і чулымі адзін да аднаго. Па гэтай прычыне, думаецца, слова «чалавечнасць» такое надзённае |
| | Пачаць з афарызма ці прыказкі<br><br>і яго (яе) каментавання | 1.1 Што такое спачуванне? На гэта пытанне вельмі дакладна адказаў беларускі пісьменнік ... : «...».<br>1.2 Што такое дабрыня? Каб адказаць на гэта пытанне, звярнуся да слоў ..., які сказаў: «...».<br>1.3 Усім вядома прыказка ... .<br><br>2.1 Каб пацвердзіць сказанае, звернемся да жыццёвых назіранняў.<br>2.2 Праілюстраваць сказанае можна прыкладамі з жыццёвага вопыту і мастацкіх твораў |

ProPowerPoint.Ru

| | |
|---|---|
| Аргументы (доказы) | 1. Абагульненне пэўных жыццёвых фактаў: жыццёвая гісторыя, якая адбылася з табой, з тваім сябрам, бацькамі або іх знаёмымі і пад.<br>2. Паказальная гісторыя са СМІ.<br>3. Зварот да прачытанага мастацкага твора, прысвечанага дадзенай тэме.<br>4. Зварот да кінастужкі (тэлеперадачы, падкаста, блога і інш.), у якім раскрыта дадзеная тэма.<br>5. Апора на гістарычныя (дакументальныя) факты ці статыстыку. Пераказ або цытаванне (пры неабходнасці) |

| | |
|---|---|
| Пераход да аргументаў | 1. Паспрабуем разабрацца ў сэнсе гэтага паняцця (праблемы).<br>2. Каб даказаць свой пункт гледжання, звярнуся да мастацкіх твораў і жыццёвага вопыту.<br>3. Каб пацвердзіць думку, звернемся да мастацкіх твораў і прыкладаў з жыцця |

ProPowerPoint.Ru

| | |
|---|---|
| Уключэнне аргументаў (доказаў) | 1. У якасці правільнасці (слушнасці) выказанага тэзіса возьмем выпадак … .<br>2. У якасці аргумента, які пацвярджае маю думку аб тым, што такое …, хацелася б прывесці прыклад з жыцця.<br>3. Вельмі добра пра гэта гаворыцца ў … . Аўтар даводзіць нам, што...<br>4. Разважаючы над пытаннем, што такое ..., хачу згадаць выпадак са свайго жыцця.<br>5. Вышэй адзначалася, што...<br>6. Дзеля пацвярджэння таго, як я разумею слова «…», прывяду прыклад з жыцця.<br>7. Пачаць аргументацыю мне хацелася б прыкладам з прачытанага мастацкага твора.<br>8. Акрамя таго, спашлюся на ўласны вопыт |
| | Моўныя сродкі:<br>- дзеясловы 1-й асобы мн. ліку (дакажам, знойдзем, пацвердзім, прывядзём, вызначым і інш.);<br>- злучнікі і злучальныя словы (бо, так што, таму, калі, каб; для таго, каб і інш.) |
| | Сінтаксічныя канструкцыі:<br>- гэта пацвярджаецца…;<br>- гэта абумоўлена тым…;<br>- адсюль зразумела, што...;<br>- гэта тлумачыцца тым…;<br>- прычына хаваецца ў наступным…;<br>- з гэтага вынікае, што…;<br>- гэта дазваляе выказаць здагадку, што...<br>- як бачым, думаю, безумоўна, бясспрэчна, зразумела, напэўна, сапраўды, праўда, пэўна, відавочна, відаць, здаецца, здавалася, мабыць, магчыма, можа, мусіць і інш.;<br>- па-мойму, на мой погляд, з пункту гледжання (каго-небудзь), на думку (каго-небудзь), як вядома, як кажуць і інш. |

| | |
|---|---|
| Вывад | 1. Думаю, мы пераканаліся, што...<br>2. У выніку мы пераканаліся, што...<br>3. Прыведзеныя доказы пераканалі нас у тым, што...<br>4. Усё сказанае пераконвае нас у тым, што...<br>5. Падводзячы вынікі, можна зрабіць выснову: ... .<br>6. Такім чынам, мы пераканаліся: ... .<br>7. Адным словам, словам, карацей кажучы, як гаворыцца, як бачна і інш. |

ProPowerPoint.Ru

У якой форме весці работу?

Ці не будуць сачыненні аднолькавымі?

ProPowerPoint.Ru


ISSN 1993-2030
БЕЛАРУСКАЯ МОВА І ЛІТАРАТУРА
"У дапамогу педагогу"
Серыя
Сто тысяч год няхай вакол шумяць палі,
Сто тысяч год няхай вакол гудуць дубровы,
Пакуль гучыць вакол святая наша мова,
Пакуль жывуць беларусы на Зямлі.
Ул. Караткевіч
1 (267)
студзень
2024